




# БДТУ 20 мая правядзе Дзень адкрытых дзвярэй для будучых лесаводаў

17.05.2018 12:52

**Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт запрашае абітурыентаў 2018 года на Дзень адкрытых дзвярэй. Выбраць факультэт і вызначыцца з выбарам будучай спецыяльнасці школьнікам дапамогуць 20 мая ў 12.00 (г. Мінск, вул. Свярдлова, 13-а).**

На Дні адкрытых дзвярэй будуць прадстаўлены спецыяльнасці, на якія плануецца ажыццяўляць прыём абітурыентаў сёлета, асаблівасці правядзення цэнтралізаванага тэсціравання і іншая важная інфармацыя. Для абітурыентаў будуць таксама арганізаваны экскурсіі па вучэбных кабінетах і лабараторыях, у якіх праводзяцца заняткі, для азнаямлення з матэрыяльна-тэхнічнай базай і сацыяльна-бытавымі ўмовамі навучання ва ўніверсітэце.

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт сёння з'яўляецца вядучай ВНУ ў краіне, якая вядзе падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для лясной, дрэваапрацоўчай, паліграфічнай і іншых галін.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


## Чытайце таксама

- **У сталічных ВНУ 1 красавіка пройдуць Дні адкрытых дзвярэй**
- **Што такое мульчыравальнік?**
- **Валерый Цапкала: ПВТ зацікаўлены ў пашырэнні супрацоўніцтва з БДТУ**
- **Акадэмія навук і БДТУ заключылі пагадненне аб супрацоўніцтве**
- **У Інстытуце пагранічнай службы адбыўся Дзень адкрытых дзвярэй**

Тэгі: Дзень адкрытых дзвярэй | лесавод | Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт

66 праглядаў Друкаваная версія

Падзяліцца:



## Дадаць каментар

**Вашае імя**

**Каментарый** *

Я не робот

reCAPTCHA

Конфиденциальность - Условия использования

ЗАХАВАЦЬ

Навіны Папулярнае

10:17 Малады чалавек патануў у рацэ ў Тураве

09:52 Кавальчук: Прыход Марадоны ў "Дынама-Брэст" папулярызуе футбол

08:50 На ЧС па хакеі ў паўфінал выйшлі зборныя Швецыі, Швейцарыі і Канады

08:02 Прагноз надвор'я на 18 мая

21:49 Моладзь Віцебшчыны і Смаленшчыны стане ўдзельнікамі воднага паходу

20:45 Творчы вечар кінарэжысёра Галіны Адамовіч пройдзе 18 мая ў Маскве

УСЕ НАВІНЫ

## Выбар рэдакцыі

Калейдаскоп



### Вясёлыя гісторыі нашых чытачоў

Пра Дзеда Янука і Мурчуню, гасцінец для ўнука і такое кіно.

0 114

Грамадства



### Асабістая падсобная гаспадарка становіцца спосабам утрымання сям'і

Хоць Тамашоўскі сельсавет самы аддалены ў Брэсцкім раёне — адлегласць да горада складае 60 кіламетраў — тут зусім няшмат зямлі, якую можна аддаць пад асабістую падсобную гаспадарку.

0 68

Грамадства



## Як жыве першы камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання

Добрая справа ва ўсходнім мікрараёне Баранавіч пачалася ў 2003-м.

0 61

Грамадства



## ДАІ растлумачыла, навошта патрэбны штрафныя балы і іншыя новаўвядзенні

Праект змяненняў у закон «Аб дарожным руху» вынесены на грамадскае абмеркаванне.

0 162

Нашы партнёры:

ПАДПІСКА

© 1998—2018 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ "Выдавецкі дом "Звязда".
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.



2 020
871
828

Создание сайта
Обслуживание сайта